ЭНЦЫКЛІКА

# FRATELLI TUTTI

**Святога Айца Францішка**

**Прысвечаная братэрству і сацыяльнаму сяброўству**

## ШТО ГЭТА?

Трэцяя энцыкліка папы Францішка пасля *"Lumen fidei"* (2013) е *"Laudato si'"* (2015).

Падпісана 3 кастрычніка 2020 г. у Асізі.

## НА ЧЫМ АСНОЎВАЕЦЦА?

- Пытанні, звязаныя з братэрствам і сацыяльным сяброўствам, якія ў апошнія гады сталі прадметам занепакоенасці Пантыфіка.
- Тэмы, узнятыя ў "Дэкларацыі аб братэрстве паміж людзьмі, міры ў свеце і агульным суіснаванні", падпісанай разам з Вярхоўным імамам *Ахмедам Эль-Таебам* у лютым 2019 г.

## ДА КАГО ЗВЕРНУТА?

Да ўсіх людзей, якія ператвораць гэтае разважанне ў пачатак дыялогу.

## ЯК ПАБУДАВАНА ЭНЦЫКЛІКА?

- *Fratelli tutti* складаецца з агульных уводзінаў і васьмі раздзелаў.

**Уводзіны**
**Раздзел I:** Цені замкнёнага свету
**Раздзел II:** Чужынец на дарозе
**Раздзел III:** Задумваць і ствараць адкрыты свет
**Раздзел IV:** Сэрца, адкрытае на ўвесь свет
**Раздзел V:** Найлепшая палітыка
**Раздзел VI:** Дыялог і сацыяльнае сяброўства
**Раздзел VII:** Маршруты новай сустрэчы
**Раздзел VIII:** Рэлігіі на службе братэрству ў свеце

## ШТО ПРАПАНУЕ?

- Гэта сацыяльная энцыкліка, прысвечаная братэрству і сацыяльнаму сяброўству.
- Яна засяроджваецца на ўніверсальным вымярэнні вучэння пра братэрскую любоў.
- Паразважаць, каб адказаць новай марай пра братэрства і сацыяльнае сяброўства.
- Марыць як адзінае чалавецтва, як вандроўнікі з адной чалавечай плоці.

## АДКУЛЬ ПАХОДЗІЦЬ НАЗВА?

- *Fratelli tutti* (Усе браты) – гэта выраз св. Францішка Асізскага (Admoniciones, 6, 1).
- Святы выкарыстоўваў яе, каб прапанаваць форму жыцця са смакам Евангелля.
- Св. Францішак заахвочваў усіх людзей да любові, якая б перавышала геаграфію і прастору.

**ХРЫСЦІЯНСКАЯ ЭКУМЕНІЧНАЯ МАЛІТВА**

"Прыйдзі, Дух Святы! Пакажы нам сваю прыгажосць,
якая адбіваецца ва ўсіх народах зямлі,
каб мы ўсвядомілі, што ўсе – важныя,
усе – патрэбныя, што мы – розныя аблічча
аднаго, умілаванага Богам чалавецтва".
**Амэн**

ЭНЦЫКЛІКА

# FRATELLI TUTTI

*Святога Айца Францішка*

**Прысвечаная братэрству і сацыяльнаму сяброўству**

## ЦЕНІ ЗАМКНЁНАГА СВЕТУ

*Папа Францішак адзначае тэндэнцыі, якія наносяць шкоду ўніверсальнаму братэрству*

**“Усё больш глабалізаванае грамадства робіць нас блізкімі, але не робіць братамі”**



**У ЯКІХ АСПЕКТАХ НАЗІРАЮЦЦА ЦЕНІ ЗАМКНЁНАГА СВЕТУ?**

- Адсутнасць надзеі і недавер, якія сеюцца ў грамадстве.
- Палярызацыя, якая не спрыяе дыялогу і суіснаванню.
- Адчужэнне і “прынясенне ў ахвяру” асобных катэгорый людзей.
- Няроўнасць правоў і новыя формы нявольніцтва.
- Заняпад этыкі і аслабленне духоўных каштоўнасцей.

**СЁННЯ МЫ З’ЯЎЛЯЕМСЯ СВЕДКАМІ МАНІПУЛЯЦЫІ ВЕЛІЧНЫМІ СЛОВАМІ:**

**СВАБОДА** СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ДЭМАКРАТЫЯ **АДЗІНСТВА**

Перад абліччам усяго гэтага *Fratelli tutti* паказвае, што патрэбны

**“шлях – гэта блізкасць і культура сустрэчы”**

Бог працягвае сеяць у чалавецтве зерне дабра.

Дабро, любоў, справядлівасць і салідарнасць трэба заваёўваць штодня.

Каб адкрыцца на высокія ідэалы, надзея здольная глядзець па-за выгодай, якая нас занявольвае.

ЭНЦЫКЛІКА

# FRATELLI TUTTI

*Святога Айца Францішка*

**Прысвечаная братэрству і сацыяльнаму сяброўству**

## ЧУЖЫНЕЦ НА ДАРОЗЕ

**ЯКІЯ ПЕРСАНАЖЫ ПРЫСУТНІЧАЮЦЬ У ПРЫПАВЕСЦІ ПРА ДОБРАГА САМАРАНІНА?**

- РАЗБОЙНІКІ
- ПАДАРОЖНЫЯ, ШТО ПРАХОДЗІЛІ МІМА
- ПАКІНУТЫ І ПАРАНЕНЫ ЧАЛАВЕК

**Перад аблiччам гэтай сітуацыі *Fratelli tutti* пытаецца:**

**?**

**З кім ты сябе атаясамліваеш? Хто твой бліжні?**



"Езус не заклікае нас разважаць над тым, кім ёсць нашыя бліжнія; Ён заклікае самім станавіцца бліжнімі".

**СЁННЯ ГІСТОРЫЯ ПРА ДОБРАГА САМАРАНІНА ПАЎТАРАЕЦЦА:**

1. Дэтэрмінізм або фаталізм імкнуцца апраўдваць абыякавасць.
2. Грамадства мае схільнасць пагарджаць іншымі.
3. Свет дапускае адчужэнне.
4. Мы з'яўляемся сведкамі сацыяльнай і палітычнай нядбаласці.

***Fratelli tutti* заклікае браць актыўны ўдзел у рэабілітацыі параненага грамадства.**

Для любові не мае значэння паходжанне параненага брата:



**ЛЮБОЎ РАЗРЫВАЕ КАЙДАНЫ І НАВОДЗІЦЬ МАСТЫ.**

**ПРОЙДЗЕШ МІМА ЦІ СПЫНІШСЯ ПОБАЧ З ПАРАНЕНЫМІ ЎЗДОЎЖ ДАРОГІ?**

Перад аблічччам мноства болю, мноства ран адзінае выйсце – быць як Добры Самаранін.

# ЗАДУМВАЦЬ І СТВАРАЦЬ АДКРЫТЫ СВЕТ

## Езус казаў: *“Усе вы – браты”* (Мц 23,8)

**Заклік да ўніверсальнага братэрства прадугледжвае адкрытасць:**

- Чалавек дасягае сваёй паўнаты, калі ахвяруе сябе дзеля іншых.
- Любоў патрабуе большай здольнасці прымаць іншых, інтэгруючы перыферыі.
- Любоў, якая пашыраецца па-за межы, мае ў сваёй аснове “сацыяльнае сяброўства”.



**ПАШЫРАЦЬ ДАБРО – ЗНАЧЫЦЬ ПАШЫРАЦЬ КАШТОЎНАСЦІ, ЯКІЯ ВЯДУЦЬ ДА ЎСЕБАКОВАГА ЧАЛАВЕЧАГА РАЗВІЦЦЯ.**

## Як гэтага можна дасягнуць?

- ✓ Думаючы і дзейнічаючы з пункту гледжання супольнасці.
- ✓ Змагаючыся са структурнымі прычынамі беднасці і няроўнасці.
- ✓ Патрабуючы прысутнай і актыўнай дзяржавы, якая б рабіла інвестыцыі на карысць уразлівых асоб.
- ✓ Гарантуючы, што ніхто не застанецца адчужаным.
- ✓ Забяспечваючы працяглы мір, пачынаючы з глабальнай этыкі салідарнасці і служэння.

***Кожная асоба каштоўная і мае права на годнае жыццё.***

ЭНЦЫКЛІКА

# FRATELLI TUTTI

*Святога Айца Францішка*

**Прысвечаная братэрству і сацыяльнаму сяброўству**

## СЭРЦА, АДКРЫТАЕ НА ЎВЕСЬ СВЕТ

### ЯКІЯ МЕРЫ ВЯДУЦЬ ДА ЎНІВЕРСАЛЬНАГА БРАТЭРСТВА?

1. Прымаць, абараняць, спрыяць, інтэграваць і спрыяць развіццю мігрантаў і ўсіх адкінутых асоб.
2. Спрыяць росту ўсведамлення таго, што ўратуюцца або ўсе, або ніхто.
3. Шукаць сусветнага юрыдычнага, палітычнага і эканамічнага парадку, які б імкнуўся да салідарнага развіцця ўсіх народаў.

### Што такое дармовасць?

- Рабіць рэчы, таму што яны добрыя па сваёй сутнасці.
- Дзейнічаць, не спадзеючыся атрымаць для сябе нейкі вынік або штосьці ўзамен.
- Уключаць усіх чужынцаў, а не толькі тых, якія нясуць адчувальную выгаду.



"Сапраўдная якасць розных краін свету вызначаецца па здольнасці думаць як чалавечая сям'я. Бог заўсёды дае дарма".

### Кожная здаровая культура – па сваёй прыродзе адкрытая і гасцінная:

Адкрытасць розуму і сэрца дапамагае нам зразумець тых, хто адрозніваецца.

Ва ўніверсальным адзінстве кожная чалавечая група знаходзіць сваю прыгажосць.

Чалавек – абмежаваная істота, якая не мае межаў.

Ці магчымая ў сям'і нацый здольнасць адкрыцца на бліжняга?

# НАЙЛЕПШАЯ ПАЛІТЫКА

***"Любоў, паводле вучэння Езуса, - гэта абагульненне ўсяго Закону"*** **(гл. Мц 22,36-40)**

## У чым заключаецца добрая палітыка?

- Яна накіравана на служэнне ўсеагульнаму дабру.
- Не імкнецца толькі да таго, каб застрахаваць сябе галасамі.
- Спрыяе сродкам для асабістага росту людзей.
- Развівае эканоміку, якая спрыяе вытворчай разнастайнасці і прадпрымальніцкай крэатыўнасці.
- Думае ў шырокай перспектыве і ўключае міждысцыплінарны дыялог.

**_FRATELLI TUTTI_ ЗААХВОЧВАЕ ДА САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАГА ПАРАДКУ, ДУШОЙ ЯКОГА БЫЛА Б САЦЫЯЛЬНАЯ ЛЮБОЎ:**

- ✓ Дазваляе нам рухацца наперад у кірунку цывілізацыі любові, да якой усе мы пакліканыя.
- ✓ Бачыць у кожным чалавеку брата або сястру, уключаючы ўсіх.
- ✓ Любоў патрабуе святла праўды, якое адначасова з'яўляецца святлом розуму і веры.



**"Сацыяльная любоў заахвочвае нас любіць усеагульнае дабро і сапраўды шукаць дабра для ўсіх людзей у сацыяльным вымярэнні, якое іх аб'ядноўвае".**

**У палітычнай дзейнасці кожная асоба – святая і годная нашай любові і нашай адданасці:**

"Калі здолееш дапамагчы ўсяго аднаму чалавеку жыць лепш, гэтага будзе ўжо дастаткова, каб апраўдаць дар твайго жыцця".

# ДЫЯЛОГ І САЦЫЯЛЬНАЕ СЯБРОЎСТВА

## Што значыць “весці дыялог”?

- **НАБЛІЗІЦЦА**
- **ВЫКАЗАЦЦА**
- **ВЫСЛУХАЦЬ АДЗІН АДНАГО**
- **ПАГЛЯДЗЕЦЬ АДЗІН НА АДНАГО**
- **ПАЗНАЁМІЦЦА**
- **ПАСТАРАЦЦА ЗРАЗУМЕЦЬ АДЗІН АДНАГО**
- **ШУКАЦЬ КРОПКІ СУТЫКНЕННЯ**



**ЗГОДНА З КУЛЬТУРАЙ СУСТРЭЧЫ:**

**ад кожнага можна нечаму навучыцца, ніхто не бескарысны, ніхто не непатрэбны.**

**ПЛЮРАЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА, ЯКОЕ ЗАПРАШАЕ ДА ДЫЯЛОГУ:**

1. У кожнай сітуацыі паважае годнасць іншых людзей.
2. Аб’ядноўвае разнастайныя рэчаіснасці, забяспечваючы рэальны і салідарны мір.
3. Вызнае права іншага чалавека на самабытнасць, аднаўляючы ветлівасць.

### Якія падыходы або падзеі не спрыяць дыялогу?

- Агрэсія, да праяўлення якой мы можам дайсці, напрыклад, у сацыяльных сетках.
- Маналогі, якія не спыняюцца, каб выслухаць іншага.
- Раптоўны і абразлівы падрыў даверу.

***Сапраўдны сацыяльны дыялог прадугледжвае здольнасць паважаць пункт гледжання іншага чалавека.***

# МАРШРУТЫ НОВАЙ СУСТРЭЧЫ

**НА ШЛЯХАХ МІРУ ПРАЦЭСЫ АБНОЎЛЕНАЙ СУСТРЭЧЫ САПРАЎДЫ НЕАБХОДНЫЯ:**

- ✓ У сапраўдным прымірэнні.
- ✓ У агульным праекце, які не адмаўляе чалавека.
- ✓ У прызнанні, гарантаванні і аднаўленні годнасці ўсіх людзей.
- ✓ У прыярытэтным клопаце пра бедных, апошніх, адчужаных.
- ✓ У аднаўленні каштоўнасці і разуменні сутнасці прабачэння.

**Езус ніколі не заклікаў да распальвання насілля або нецярпімасці.**
**Евангелле патрабуе прабачаць *“семдзесят сем разоў”*** (Мц 18,22)

**САПРАЎДНАЕ ПРАБАЧЭННЕ І САПРАЎДНАЕ ПРЫМІРЭННЕ:**

- Дасягаюцца ў канфлікце, які пераадольваецца з дапамогай дыялогу.
- Устрымліваюцца ад праяўлення ўзаемнай варожасці і нянавісці.
- Спрыяюць шчырай дыскусіі, заснаванай на любові дзеля справядлівасці.
- Не прадугледжваюць забыцця або беспакаранасці.
- Не ўпадаюць у заганны круг помсты.



> *“Прашу Бога, каб Ён падрыхтаваў нашыя сэрцы да сустрэчы з братамі, незалежна ад рознасці ідэй, моў, культур, рэлігій”*
>
> *ПАПА ФРАНЦІШАК*

# РЭЛІГІІ НА СЛУЖБЕ БРАТЭРСТВА Ў СВЕЦЕ

## ТОЛЬКІ МАЮЧЫ СВЯДОМАСЦЬ СЫНОЎ, МОЖНА ЖЫЦЬ У МІРЫ ПАМІЖ САБОЙ:

Розныя рэлігіі робяць каштоўны ўнёсак у будаўніцтва братэрства.

Пошукі Бога дапамагаюць нам бачыць адзін у адным спадарожнікаў на шляху: **братоў.**

Пазбаўленне свабоды сумлення і веравызнання аслабляе чалавецтва.

## КАСЦЁЛ – ГЭТА ДОМ З АДЧЫНЕНЫМІ ДЗВЯРЫМА, ТАМУ ШТО ГЭТА МАЦІ:

1. Наводзіць масты
2. Разбурае муры
3. Сее прымірэнне

## СЯРОД РЭЛІГІЙ МАГЧЫМЫ ШЛЯХ МІРУ:

- Адпраўным пунктам павінен быць позірк Бога, таму што Бог глядзіць сэрцам.
- Жорсткасць не знаходзіць асновы ў рэлігійных перакананнях.
- Шчырае і пакорнае пакланенне Богу вядзе да павагі жыцця, годнасці і свабоды.



*Рэлігійныя лідары пакліканы быць сапраўднымі прыхільнікамі дыялогу: каб у будаўніцтве міру паводзіць сябе як аўтэнтычныя пасрэднікі.*

## ХРЫСЦІЯНСКАЯ ЭКУМЕНІЧНАЯ МАЛІТВА

Наш Божа, Тройца любові,
з магутнай лучнасці Тваёй Боскай блізкасці
пралі сярод нас раку братэрскай любові.
Адары любоўю, якая праяўлялася ва ўчынках Езуса,
у Яго назарэтанскай сям'і і ў першай хрысціянскай супольнасці.

Дазволь нам, хрысціянам, жыць Евангеллем
і заўважаць Хрыста ў кожным чалавеку,
каб бачыць Яго, укрыжаванага, у горы пакінутых
і забытых гэтага свету
і Уваскрослага – у кожным браце, які ізноў стаў на нogі.

"Прыйдзі, Дух Святы! Пакажы нам сваю прыгажосць,
якая адбіваецца ва ўсіх народах зямлі,
каб мы ўсвядомілі, што ўсе – важныя,
усе – патрэбныя, што мы – розныя аблічча
аднаго, умілаванага Богам чалавецтва".
**Амэн**